# ЯКУБ КОЛАС



# *Акінчыцы*



- **Якуб Колас** нарадзіўся 3 лістапада 1882 г. у засценку *Акінчыцы* Мінскага павета Мінскай губерніі (цяпер у межах горада Стоўбцы Мінскай вобласці).



# Уплывы на фарміраванне асобы творцы

Жыццё ў Альбуці, маляўнічыя навакольныя краявіды, цікавыя апавяданні розных падарожных, якія, як успамінаў пазней пісьменнік, раскрывалі яму новы свет разуменняў і ўяўленняў, пакінулі значны след у душы юнага Кастуся. Слухаў ён і беларускія песні, якія спявала маці. Вялікі аўтарытэт меў у падлетка дзядзька па бацьку — Антось, які першы абудзіў цікавасць да літаратуры.

# Першы верш "Вясна"

Ідзе вясна ўжо, дзякуй Богу!
Згінуў снег з сырой зямлі;
Папсавала гразь дарогу,
Перавалы загулі.

Сонца грэе, прыпякае;
Лёд на рэчцы затрашчаў.
Цёплы вецер павявае,
Хмар дажджлівых нам прыгнаў.

Вось і бусел паказаўся,
Гусі дзікія крычаць,
Шпак на дубе расспяваўся,
Жураўлі ўжо ляцяць.

І зіма, як дым, прапала!
Зелянее луг, ралля.
Як ад болю, ачуняла
Наша родная зямля

# *Нясвіжская настаўніцкая семінарыя*

- Падчас вучобы у семінарыі пачаў ствараць вершы і празаічныя творы на беларускай мове. Складаў вершы аб прыродзе, нялёгкім існаванні селяніна, напісаў паэмы "Каля кастра" і "Страх", тэксты якіх не захаваліся, а таксама першы празаічны твор – ***этнаграфічны нарыс "Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле"***.



# Першы надрукаваны твор паэта



Цана асобнаго нумэру 5 кап. (10 грошэй).

Вильня, 1 сенцября 1906 г.

№ 1.

Год I.

# Наша Доля

першая белоруская газэта для вёсковаго и местоваго рабочаго народу.

ВЫХОДЗИЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ рускими и польскими литерами.

Адрэс рэдакции и администрации: *Вильня, Виленская вулица 32*

**Цана:** з перасылкаю и дастаукаю да хаты: на 1 год—**3 руб.**, на 6 месяцоу—**1 руб. 50 кап.**, на 3 мес.—**75 кап.**, на 1 мес.—**25 кап.** Без дастауки и перасылки: на 1 год — **2 р. 40 к.**, на 6 мес.—**1 р. 20 к.**, на 3 мес.—**60 кап.**, на 1 мес. — **20 кап.** За граніцою: на 1 год—**4 руб.**, на 6 мес.—**2 р.**, на 3 мес.—**1 руб.** Перамена адросу—**20 кап.**

АБЪЯУЛЕННЯ прыймаюцца на паследней страницы па **20 кап.** за линейку петит.

Рукаписы и карэспандэнции, присыланыя у Рэдакцию, мусяць быць чытельна написаны з фамилъею и адресомъ таго, хто ие присылае. Адресъ тольки для ведама Рэдакции.

## Наш палетак.

Наш палетак памиж межау,
З-за каторых цвяце збожа;
А наш скэавак штось залежау;
Наш загон зысци ня можэ.
Ци то глеба да ничога?
Ци то руки у нас слабые,
Што ня маем й зерня свога,
Што мы хэдзим як сляпые?
Глеба чорна, у руках сила,
Тольки нашых гаратаяу
Некасць мара усё звадзила
Гэн замежы да выраяу.
Наш сявец не раз там кидау
Залатое зерне з жмени,
Ён не раз там плёны выдау.
А у нас расли камени.
Наш палетак негараны,
Палынами цвяце нива.
Нука, братцы, кумы, сваты,
Да работы станьма жыва!
Хто гараци добра зможэ,
Хто разоры скоро ладзиць,
Хто шчасливе сее збожа,
Хто гароды добра садзиць
Жыво, жыво за работу
Без аглядки хто што можэ.
Усе роуны без расчоту
Усих праца будзе згожа!

*Мацей Крапивка.*

## Да чытацелёу.

Прачхнууся з цяжукаго сну народ, падняуся як рэка на вясну за вяликае дзело свабоды и лепшае доли. Тольки з пад стрэхи цёмное хаты мужыка беларуса як дауней, як сотни гадоу таму назад веець холадом магильнаго сну. Там нядоля, цямнота и голад, яго прадауные вороги, звили сабе крэпкое гняздо, разраслися, распладзилися. Бывали таки и гэтакіе минуты у гисторыи апошних гадоу, што прасыпауся и беларус.

Галодны и цёмны будзіуся ён з цяжкаго сну и дзивавауся, и слухау як з далёкаго свету з усих старон лящели да яго развалушаеся хаты радосные весьци аб зямли, аб сва-

- **1 верасня 1906 г.** у віленскай беларускамоўнай газеце "Наша доля" з'явіўся верш —*"Наш родны край"*. Тут упершыню быў выкарыстаны псеўданім Якуб Колас

# Турэмнае зняволенне

- 15 верасня 1908 г. Якуб Колас асуджаны на 3 гады турэмнага зняволення паводле абвінавачання ў актыўных дзеяннях, накіраваных на выкананне праграмы Усерасійскага саюза настаўнікаў, які, як было заяўлена на судзе, меў на мэце ліквідацыю існуючага ў Расійскай імперыі грамадскага ладу (у тым ліку ў складанні адозвы да настаўнікаў, хоць пісаў яе іншы чалавек, якога Колас суду не назваў). Увесь тэрмін пакарання Якуб Колас адбываў у Мінскім астрозе.



# Першы зборнік вершаў "Песні жальбы"



# Сустрэча з Янкам Купалам

У жніўні 1912 г. на хутары Смольня, каля вёскі Мікалаеўшчына, адбылася яго першая сустрэча з Янкам Купалам, якая паклала пачатак іх сяброўству



# Сям’я Якуба Коласа

- У чэрвені 1913 г. Канстанцін Міцкевіч узяў шлюб з настаўніцай пінскай чыгуначнай школы Марыяй Каменскай, з якой яны пражылі разам больш за 30 гадоў, мелі трох сыноў (Даніла, Юрка, Міхась).



# Годы Першай сусветнай вайны



- Падчас Першай сусветнай вайны ў 1915 г. у сувязі з набліжэннем фронту Якуб Колас разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Маскоўскую губерню, дзе быў мабілізаваны на вайсковую службу. Пасля заканчэння Аляксандраўскага ваеннага вучылішча (Масква, 1916 г.) служыў у запасным палку ў г. Перм. У сувязі з хваробай атрымаў адпачынак і паехаў да сям'і ў горад Абаянь (цяпер Курская вобласць Расіі).

# 1920 -1930-я гг.

- У 1921 г. Якуб Колас вярнуўся ў Мінск. Быў супрацоўнікам Навукова-тэрміналагічнай камісіі Народнага камісарыята асветы, літаратурнай камісіі па збіранні вуснай народнай творчасці Інстытута Беларускай Культуры, выкладаў у Беларускім педагагічным тэхнікуме, чытаў лекцыі па граматыцы і методыцы выкладання беларускай мовы на настаўніцкіх педагагічных курсах у Слуцку, працаваў выкладчыкам беларускай мовы ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

# Паэма "Новая зямля"




- У паэме Колас па-філасофску асэнсоўвае цэлую эпоху ў жыцці беларускага народа. Аўтар апаэтызаваў духоўнае багацце і маральную веліч працоўнага чалавека, яго адвечную мару быць гаспадаром на ўласнай зямлі. У творы яскрава апісаны побыт народа, выведзены тыповыя беларускія характары.

# Паэма “Сымон-музыка”

- Гэта твор аб народных вытоках мастацтва, лёсе таленту з народа, духоўным адраджэнні нацыі. Трагічныя і драматычныя матывы ў ім пераплятаюцца з жыццясцвярджальнымі і аптымістычнымі. Паэт асвятляе своеасаблівасць нацыянальнага шляху беларусаў, выказвае надзею на актывізацыю духоўна-творчых сіл народа.





# Апошнія гады жыцця

Пасля вайны, з сярэдзіны 1940-х гг. і да канца жыцця, Якуб Колас працаваў у Акадэміі навук Беларусі, быў вядомы як грамадскі дзеяч. У яго заўсёды знаходзілі водгук праблемы асобных грамадзян, паслядоўна адстойваў ён інтарэсы і ўсёй беларускай нацыі. У 1956 г. пісьменнік падрыхтаваў ліст у вышэйшыя партыйныя інстанцыі, дзе выказаў занепакоенасць становішчам беларускай мовы ў грамадскім жыцці, прапанаваў меры па яе абароне.

# Аповесць “На ростанях”




- У 1954 г. была завершана аповесць "На ростанях", у якой апісаны падзеі 1906-1911 гг. Яна стала 3-й, апошняй (разам з дзвюма папярэднімі — "У палескай глушы", "У глыбі Палесся"), часткай аднайменнай трылогіі.

# Магіла Якуба Коласа



# Памяць

- Імем Коласа названы Інстытут мовазнаўства і Цэнтральная навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр у Віцебску, плошчы і вуліцы, школы і бібліятэкі ў многіх населеных пунктах Беларусі, буйное вытворчае паліграфічнае прадпрыемства ў Мінску. Творы Якуба Коласа ўвасоблены ў тэатральным, музычным, кінематаграфічным мастацтве. У тэатрах ставіліся п'есы паводле яго апавяданняў, аповесцей, трылогіі. Ю. Семянякам створана опера па паэме "Новая зямля", Ю. Багатыровым па аповесці "Дрыгва" — опера "У пушчах Палесся". На словы Якуба Коласа напісана шмат музычных твораў. Коласаўскую паэзію для напісання песень і рамансаў выкарыстоўвалі кампазітары М. Чуркін (песні "Краска", "Вясна", рамансы "Маёй каханцы", "Гусі..."), А. Туранкоў (рамансы "Усход сонца", "Дудка", песня "Радасць"), Я. Цікоцкі (рамансы "Каманіну, Малакову, Сляпнёву", "Пераможны май") і інш. Яшчэ ў 1929 г. быў зняты фільм "Песня вясны" (рэжысёр В. Гардзін) паводле аповесці Якуба Коласа "На прасторах жыцця". У 1960-1961 гг. экранізавана трылогія "На ростанях" (фільм "Першыя выпрабаванні", рэжысёр Ул. Корш-Саблін).